## *УПЭЎНЕНЫЯ КРОКІ УНІВЕРСІТЭЦКАЙ НАВУКІ*
### *(ад рэдактара)*

*Правядзенне навукова-творчых выніковых канферэнцый у Беларускім універсітэце культуры мае трывалую шматгадовую традыцыю і дае магчымасць абмяняцца назапашаным вопытам арган-ізацыі навуковай работы, абмеркаваць актуальныя праблем ў развіцці культуры і мастацтва.*

*А падзяліцца і расказаць ёсць аб чым, бо наша навучальная ўстанова канцэнтруе ў сабе моцны патэнцыял навукоўцаў, якія працуюць у самых розных накірунках. Сярод навукоўцаў 11 дактароў навук, прафесараў, 102 кандыдаты навук, дацэнты. Гэта 37% агульнай колькасці прафесарска-выкладчыцкага складу універсітэта.*

*Па плану навукова-даследчых работ сёння распрацоўваецца 31 тэма, 15 з іх маюць фундаментальны характар, 9 - прыкладны, 7 - педагагічны.*

*Частка тэм выконваецца ў рамках агульнарэспубліканскіх праграм, напрыклад «Літаратура ў кантэксце абнаўлення духоўнай культуры на сучасным этапе» (навуковы кіраўнік прафесар Грынчык М.М.), «Культура ў сістэме эканамічных адносін» (навуковы кіраўнік дацэнт Ігнатовіч П.Р.), «Гісторыя і сучасны стан беларускай бібліяграфіі» (навуковы кіраўнік прафесар Лявончыкаў В.Е.) і іншыя, прынятыя да распрацоўкі сумесна з Акадэміяй навук, Нацыянальнай бібліятэкай і маючыя важнае значэнне ў вырашэнні праблем духоўнага развіцця краіны.*

*Толькі па выніках навуковай працы за 1993 год калектывам нашых навукоўцаў да друку падрыхтавана 18 рукапісаў манаграфічных даследаванняў, падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў, а таксама шмат распрацовак навукова-метадычнага харак-тару.*

*Нягледзячы на складанасці ў эканамічным жыцці, адсутнасць фінансавання, калектывам робяцца захады па стварэнню навукова-даследчых лабараторый фальклору, псіхадыягностыкі і арттэрапіі, дакладных ведаў у галіне культуры і мастацтва, народных рамёстваў.*

*Рэчаіснасць патрабуе новага погляду і на сітуацыю, якая склалася ў культурным жыцці краіны, і нашы даследчыкі скіроўваюць свае намаганні на вывучэнне праблем існавання клубных і бібліятэчных устаноў у новых эканамічных умовах, маральна-духоўных аспектаў абнаўлення грамадства рэспублікі.*

*Стала ўжо прывычным, што нашы штогадовыя навуковыя мерапрыемствы цікавяць калег з іншых навучальных і навуковых устаноў рэспублікі. Колькасць жадаючых прыняць удзел у рабоце выніковай канферэнцыі з кожным годам узрастае. Гэта сведчыць аб тым, што статус канферэнцыі паступова выходзіць за рамкі чыста універсітэцкага, ад чаго прэстыжнасць гэтага мерапрыемства год ад года павялічваецца.*

*Спадзяёмся, што тэзісы выступленняў, надрукаваныя ў дадзеным зборніку, выклічуць пэўную зацікаўленасць з боку навукоўцаў, спецыялістаў у галіне культуры і мастацтва.*

**Жарыкава А.А.,**
**канд.філас.навук,**
**выкладчык**

## ХХІ СТАГОДДЗЕ: НОВЫ ТЫП ЦЫВІЛІЗАЦЫІ?

У наш час, калі набліжаецца канец XX стагоддзя, паступова прыходзіць разуменне таго, што чалавеку дазволена далека не ўсё, таму што па меры развіцця цывілізацыі ўзрастае яго залежнасць (як біялагічнага віду) ад стану біясферы. Людзі пачынаюць разумець, што ні аб ніякім «пакарэнні Прыроды» не можа быць і гаворкі. Усведамленне гэтага паступова ўваходзіць у свядомасць грамадства, становіцца часткай яго менталітэту. Існуе нейкі экалагічны імператыў умовы, які чалавек не мае права пераступіць ні пры якіх абставінах.

Але пакуль што няма адзінага падыходу пры вырашэнні праблем узаемаадносін з Прыродай, і яго выпрацоўка, якая патрабуе планетарнага кансенсусу, стане важнейшаю задачаю наступаючага стагоддзя. А пакуль што ўсе патрабаванні маюць толькі аберагальны характар, усе праблемы ў асноўным зводзяцца да лакальных. Гэты факт вельмі павольна ўсведамляецца грамадствам, як і неабходнасць змены асноў сучаснай цывілізацыі. І адзін з аспектаў праблемы ўзаемаадносін Прыроды і планетарнага супольніцтва павінен насіць у значнай ступені маральны характар. Імператыў экалагічны прывядзе да імператыву маральнага, да з'яўлення новага табу.

Адным з самых яркіх індыкатараў цывілізацыйных перамен з'яўляецца месца адукаванага чалавека ў грамадстве. Лідэрамі сусветнага развіцця становяцца краіны, здольныя забяспечыць высокі ўзровень развіцця навукі, адукаванасці сваіх грамадзян, агульнай культуры, тэхналагічнай дысцыпліны. І гэта асабліва важна ў тым плане, што важнейшай асаблівасцю новай цывілізацыі будзе далейшае развіццё інфармацыйных тэхналогій, звязаных з фарміраваннем планетарнага інтэлекту.

Калектыўны інтэлект -- вельмі важнае цывілізацыйнае паняцце. Яго сэнс толькі сёння, і то не ў поўнай меры, пачаў прыцягваць ўвагу спецыялістаў-гуманітарыяў. Калектыўны інтэлект з'яўляецца адначасова са станаўленнем індывідуальных інтэлектаў. Развіццё калектыўнага інтэлекту адбываецца вельмі шпаркімі тэмпамі асабліва ў апошнія гады, калі з'явілася сучасная інфармацыйная тэхніка.

Такім чынам, у фарміраванні новай цывілізацыі бачацца два асноўныя шляхі: пераўтварэнне чалавецтва ў адзіны біясацыяльны арганізм, станаўленне і развіццё агульнапланетарнага калектыўнага інтэлекту. Гэта можа даць неабходны імпульс далейшаму развіццю чалавецтва.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ